# СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ СІСТЭМЫ ДАШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ

*А.М. Каспяровіч, БДПУ, г. Минск*

Адным з галоўных прыярытэтаў унутранай палітыкі Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе з'яўляецца захаванне і выкарыстанне ўсяго таго карыснага і станоўчага, што было створана і назапашана ў папярэднія гады. Да дасягненняў савецкага часу безумоўна можна аднесці стварэнне эфектыўнай сістэмы дашкольнай адукацыі і выхавання, якая вытрымала выпрабаванне часам і сёння застаецца стабільным звяном сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Спробы адкрыцця ўстаноў грамадскага дашкольнага выхавання на тэрыторыі сучаснай Беларусі адбываліся і ў дарэвалюцыйны перыяд. Так, маюцца звесткі аб адкрыцці ў 1802 годзе дзіцячага дома выхавання на 28 мест у Магілёве, у 1804 годзе ў Гродна. У 1808 годзе быў адчынены выхаваўчы дом для незаконна-народжаных у Віцебску. Да пачатку XX стагоддзя колькасць устаноў дашкольнай адукацыі ўзрасла з 3 устаноў да 40 адпаведна [2, с. 23]. Асноўнымі тыпамі дашкольных устаноў у гэты перыяд з'яўляліся выхаваўчыя дамы, яслі-прытулкі, сіроцкія дамы, ачагі, народныя дзіцячыя сады, дашкольныя групы пры школах. Пераважная большасць з іх працавала ў буйных гарадах і прамысловых цэнтрах на бясплатнай аснове. У дашкольных установах дасавецкага часу адукацыйная і выхаваўчая работа не мела адзіных патрабаванняў да арганізацыі навучальнага працэсу і метадаў выхавання. Галоўнай задачай дашкольных устаноў таго часу быў звычайны дагляд за малымі дзецьмі рабочых. У асобных дзіцячых садах адукацыйна-выхаваўчая работа ўключала ў сябе простыя элементы разумовага, маральнага і фізічнага выхавання. Пры гэтым ва ўлік не браліся ўзроставыя і індывідуальныя асаблівасці дзіцяці. Час працы ўстаноў быў розным: у адных дзяцей можна было пакінуць на 6 гадзін, іншыя працавалі 4 гадзіны, былі прытулкі, дзе дашкольнікаў можна было пакінуць нанач.

Акрамя таго, існавала нязначная колькасць прыватных платных дашкольных устаноў для дзяцей з заможных сем'яў.

Колькасць навучэнцаў дашкольных навучальных устаноў беларускіх губерній у канцы XIX стагоддзя не перавышала трох тысяч [3, с. 109]. Гэта ў першую чаргу было звязана з невялікай колькасцю гарадскога насельніцтва і буйных прамысловых прадпрыемстваў у той час.

Ужо праз месяц пасля ўсталявання савецкай улады Савет народных камісараў выдаў дэкрэт аб арганізацыі Дзяржаўнай камісіі па асвеце. Дашкольная адукацыя была выдзелена ў самастойны аддзел. Такім чынам дашкольнае выхаванне было ўключана ў адзіную сістэму народнай адукацыі. У лістападзе 1917 года выйшла ў свет першая дэкларацыя па дашкольнай адукацыі. Яна дэкларавала грамадскае выхаванне дзяцей з ранняга ўзросту, непарыўную сувязь са школай. Згодна з ёй

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

выхаванне ў дзіцячых садах павінна быць бясплатным і даступным для ўсіх сасловій і нацыянальнасцей [1, с. 17]. Нягледзячы на тое, што гэтыя пастановы спачатку насілі больш дэкларатыўны характар чым працавалі ў рэчаіснасці ва ўмовах імперыялістычнай і грамадзянскіх войн, акупацый і разрухі, гэта былі вельмі важныя крокі на шляху стварэння адной з лепшых у далейшым сістэм дашкольнай адукацыі ў свеце. У Савецкай Беларусі ў 20-х гадах XX стагоддзя выхаванне дзяцей ва установах дашкольнай адукацыі, згодна новай ідэалогіі, вялося на чатырох дзяржаўных мовах: беларускай, рускай, польскай і яўрэйскай – і духе павагі да працы і сяброўства.

Кастрычніцкая рэвалюцыя прынесла з сабой велізарныя грамадскія і гаспадарчыя пераўтварэнні, якія карэнным чынам адбіліся на дашкольнай адукацыі. Змена ролі жанчыны ў савецкім грамадстве, працэсы калектывізацыі, індустрыялізацыі, урбанізацыі, мілітарызацыі, асветы насельніцтва патрабавалі велізарнага павелічэння колькасці ўстаноў дашкольнага тыпу і якасці працы з дзецьмі ў іх.

Асноўным тыпам дашкольных устаноў у савецкай дзяржаве сталі яслі-сад. У іх выхоўваліся дзеці ад 2 месяцаў да 7 гадоў. Гэта рашэнне было накіравана на ўсталяванне адзінай сістэмы выхавання дзяцей ад першага года жыцця да пераходу ў школу, на паляпшэнне арганізацыі лячэбна-прафілактычнага абслугоўвання дзяцей, на ўмацаванне сувязі бацькоў і дзіцячага сада для ажыццяўлення ўздзеяння на дзяцей.

У савецкі час працавалі асобныя дзіцячыя ўстановы – яслі, дзе выхоўваліся дзеці ад 2 месяцаў да 3 гадоў, дзіцячыя сады для дзяцей ад 3 да 7 гадоў. Установы дашкольнай адукацыі паміж сабой падзяляліся па колькасці ўзроставых груп і па працягласці знаходжання дзяцей ва ўстанове. Асноўным тыпам дашкольнай установы стаў дзіцячы сад. Савецкі дзіцячы сад працаваў ад 9 да 12 гадзін у дзень і падзяляўся на ўзроставыя групы. Так, да першай групы дзяцей ранняга ўзросту адносіліся дзеці ад 2 месяцаў да 1 года, другая група дзяцей ранняга ўзросту ўключала ў сябе дзяцей ад 1 да 2 гадоў, малодшая група – ад 2 да 3 гадоў, другая малодшая ад 3 да 4 гадоў, сярэдняя – ад 4 да 5 гадоў, старэйшая 5–6 гадоў, падрыхтоўчая да школы 6–7 гадоў адпаведна. У залежнасці ад колькасці дзяцей дазвалялася праца дзіцячых садоў з розным узроставым складам дзяцей і меншай колькасцю груп. Пры фабрыках і заводах, якія працавалі ў тры змены, функцыянавалі сады ці групы, дзе дзеці знаходзіліся кругласутачна.

Важнае месца ў сістэме дашкольных устаноў займаў дзіцячы сад санаторнага тыпу. Ён быў створаны для аздараўлення дзяцей дашкольнага ўзросту. У ім дзеці атрымлівалі павялічаны рацыён харчавання, працяглы час знаходзіліся на свежым паветры і пад пастаянным наглядам урача. Санаторныя дзіцячыя сады знаходзіліся па-за межамі горада ці ў зялёнай зоне.

Акрамя вышэйназваных тыпаў устаноў у савецкай сістэме адукацыі працавалі дашкольныя ўстановы спецыяльнага прызначэння для дзяцей з парушэннямі зроку, слыху, маўлення. У гэтых установах выхаванне і навучанне адбывалася па

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ

спецыяльнай праграме з мэтай карэкцыі і кампенсацыі іх развіцця, падрыхтоўкі да навучання ў спецыяльных школах.

З пачатку 1990-х гадоў у сістэме дашкольнай адукацыі адбыліся значныя змены як у колькасным, так і ў якасным складзе. Дзіцячыя сады Беларусі першымі адчулі дэмаграфічны і эканамічны крызіс пачатку і сярэдзіны 90-х гадоў XX стагоддзя. Пасля 1991 года сетка дашкольных устаноў у Рэспубліцы Беларусь, як і на ўсёй пастсавецкай прасторы, стала хутка скарачацца. Толькі за першы год пасля распаду СССР былі зачынены 362 дашкольныя ўстановы. Складаная эканамічная сітуацыя, у якой апынуліся прадпрыемствы, арганізацыі, калгасы пасля разрыву эканамічных сувязей, на балансе якіх знаходзіліся дашкольныя установы ставілі на павестку дня пытанне аб іх закрыцці. Гэтым было абумоўлена тое, што ў перыяд з 1991 па 1997 год колькаць дзіцячых садоў ведамственнага падпарадкавання скарацілася з 75 % да 33 % адпаведна.

У мэтах стабілізацыі сітуацыі ў галіне дашкольнай адукацыі была прынята пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб захаванні і развіцці сеткі дзіцячых дашкольных устаноў». Прапанаваны механізм захавання сеткі дзіцячых садоў дазволіў выраўняць сітуацыю. Рэалізацыя пастановы спрыяла не толькі зніжэнню інтэнсіўнасці закрыцця дашкольных устаноў, але і ўсталяванню парадкаў перадачы ведамственных устаноў на баланс мясцовых распарадчых органаў.

На сённяшні час, згодна адукацыйнаму заканадаўству Рэспублікі Беларусь, дашкольная адукацыя з'яўляецца першым узроўнем асноўнай адукацыі ў краіне і павінна забяспечыць усебаковае развіццё дзіцяці ў адпаведнасці з яго ўзроставымі і індывідуальнымі асаблівасцямі.

*Літаратура*

1. Баліцкі, А.В. Некаторыя праблемы культурнай рэвалюцыі ў галіне народнай асветы / А.В. Баліцкі // Асвета. – 1927. – № 7. – С. 3–14.

2. Каменская, Н.В. Становление народного образования в Белоруссии (1917–1929). – Минск, 1980. – 263 с.

3. Народное образование в БССР: сб. документов и материалов: в 2 т. – Минск: Наука и техника, 1919–1980. – Т. 1:1917–1927 гг. – 459 с.; Т. 2: 1927–1979 гг. – 1980. – 463 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ